# ТЭКСТ

## Сувязь сказаў у тэксце

**Успомніце**

Чым аб’яднаны сказы ў тэксце?
Выкарыстайце схему.

**Тэкст**

| **Тэма** | **Асноўная думка** |
|---|---|
| Тое, пра што гаворыцца ў тэксце | Галоўнае, пра што аўтар хоча сказаць чытачу |

**24.** Прачытайце. Дакажыце, што вы прачыталі тэкст.

### Каштаны каля школы

Увосень на сумнай пустцы побач са школай **дзеці** пасадзілі **каштаны. Саджанцы** маладыя і тонкія, таму ўсю зіму **дзеці** перажывалі, ці не змерзнуць **яны**, ці прымуцца. І ўявіце сабе: вясной на ўсіх шасці **дрэўцах** з’явіліся вялікія радасна-зялёныя лісточкі. Усе **каштаны** прыняліся! Пустка, дакладней, былая пустка стала вельмі ўтульным і вясёлым месцейкам. *(Г. Пшонік.)*

**пу́стка** — пусты ўчастак зямлі

На што ўказвае загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку?

Якія словы паўтараюцца ў тэксце? Прачытайце сказы са словамі *дзеці, каштаны*. Якія словы выкарыстоўваюцца замест слова *каштаны* ў другім і трэцім сказах?

Які прыметнік спалучаецца са словам *пустка* ў першым сказе? Як названа былая пустка ў апошнім сказе? Выпішыце з тэксту антонімы.

Выпішыце з тэксту спачатку дзеясловы ў форме прошлага часу, потым — у форме будучага часу.

Якіх дзеясловаў больш?

**?!** Што дапамагае звязаць сказы ў тэксце?

Дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце:
- аднакаранёвыя словы;
- сінонімы;
- антонімы;
- словы ***ён, яна, яно, яны, гэты, той, там, так***;
- паўтор аднаго і таго ж слова;
- дзеясловы ў форме аднаго часу.

**ахво́тна**

**25.** Прачытайце тэкст. Як хлопчык дапамагаў бацьку? Як дрэвы дзякавалі яму?

## Самыя смачныя яблыкі

Каля хаты Антося быў невялікі сад. Тут раслі яблыні розных гатункаў. Сын ахвотна дапамагаў бацьку даглядаць сад. Хлопчык палівач і падкормліваў дрэвы.



Правообладатель Акадэмія адукацыі



Яблыні адчувалі дабро і ласку людзей. Яны працягвалі да Антося галінкі з лепшымі пладамі.

Першай частавала хлопчыка невысокая разгалістая яблыня. Антось зрываў некалькі яблыкаў, з'ядаў іх пад дрэвам. Тут плады здаваліся яму больш смачнымі. *(Паводле П. Саковіча.)*

**гату́нак** — сорт, разнавіднасць
**разга́лістая** — з шырока раскінутымі галінамі

Прачытайце сказы, у якіх сустракаюцца словы *Антось, сад, яблыні*. Якія словы выкарыстоўваюцца замест іх у іншых сказах?

Назавіце аднакаранёвыя словы ў тэксце. Якое слова ўжываецца замест слова *яблыкі* ў апошнім сказе?

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Пра што ідзе размова ў кожнай частцы?

Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць?

План

1. Пачастунак ад разгалістай яблыні.
2. Падзяка яблынь.
3. Юны садоўнік.

Запішыце выпраўлены план. Спішыце тую частку тэксту, да якой прапанаваны малюнак. Падкрэсліце ў сказах дзеясловы прошлага часу.

**26.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

1. Сады садзі́ць — жыццё харашы́ць. 2. Дзе няма ахвоты, там няма работы. 3. Хто зямлі дае́, таму і зямля дае.

Якія прыказкі падыходзяць да зместу тэкстаў з практыкаванняў 24, 25? Запішыце тую прыказку, якая не падыходзіць да зместу тэкстаў.

**27.** Прачытайце сказы. Ці ўтвараюць яны тэкст?

Хлопчыкі ішлі па лясной дарозе. Раптам хлопчыкі заўважылі вырваны клёнік. Хлопчыкі паднялі клёнік і прынеслі дамоў. Хлопчыкі пасадзілі клёнік каля хаты. Клёнік хутка пайшоў у рост.

*Пеця і Міша;*
*яны, дзеці;*
*сябры;*
*дрэўца;*
*яго.*

Якія словы паўтараюцца ў тэксце? Як пазбегнуць вялікай колькасці паўтораў?

Выкарыстайце словы з правага слупка і выпраўце тэкст. Дайце назву тэксту і запішыце яго.

**28.** Спішыце тэкст, устаўляючы ў словы прапушчаныя літары.

### На лясной дарозе

Ж..ня, Алёша і Янка вярталіся з грыбоў. Сёння яны натрапілі на грыбную м..сцінку, набралі поўныя кошыкі б..равікоў. Настрой ва ўсіх быў цудоўны. Хлопчыкі вес..ла перагаворваліся, хваліліся сваімі



Правообладатель Акадэмія адукацыі

лепшымі знаходкамі. Неўзабаве стары бор скончыўся. Хутка павінна была паказацца іх вёска. Сябры прыбавілі кроку. *(Паводле П. Рунца.)*

**неўзаба́ве** — хутка, скора

Знайдзіце ў першым сказе назоўнікі. Падкрэсліце словы, якія замяняюць гэтыя назоўнікі ў іншых сказах.

❖ Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.

## Тыпы тэкстаў

**29.** Прачытайце тэксты. Якая тэма іх аб'ядноўвае?

### Жоўцік

Раніцай Жоўцік выйшаў з маці на прагулку. Ён з захапленнем агле́дзеў двор, пабег па дарожцы. Маці знайшла смачнае зярнятка і паклікала сваё куранятка.

Раптам у двор ускочыў вялікі кот. Жоўцік спалохаўся. Курыца адразу ж прыўзняла крыло. Жоўцік падбег да маці, прытуліўся да яе і супакоіўся. Потым ён соладка зажмурыўся і заснуў. *(Паводле П. Саковіча.)*

